РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 КРАСАВІКА 2007 г. АЎТОРАК
№ 62 (25927)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## ДЗЕВЯЦІКЛАСНІК ВЫРАТАВАЎ ТРАІХ ДЗЯЦЕЙ

**Алёша Кандраценка, вучань Хальчанскай базавай школы Веткаўскага раёна ў мінулую суботу са сваёй цёткай крочыў на аўтобусны прыпынак, каб даехаць да райцэнтра. І тут ён убачыў, што з акна двухпавярховага дома валіць дым. Хлапчук, не марнуючы часу, кінуўся туды, дзе каля дзвярэй адной з кватэр ужо сабраліся людзі. Калі ўдалося адкрыць яе, чорны дым (гарэла кухня) смуродам ударыў па іх. Людзі спыніліся, а Аляксей на кукішках папоўз у другі пакой, дзе, паводле яго меркавання, павінен нехта быць (ён ведаў, што тут жыве шматдзетная сям'я).**

Сапраўды, на ложку сядзелі спужаныя Валера, Святлана і Антон Тарыкі ўзростам адзін, два і тры гады. Двух дзетак Аляксей узяў за рукі, а трэцяга павёў перад сабой. У гэты самы момант полымя шуганула ў той пакой, дзе былі дзеці.

— Калі б не адвага дзевяцікласніка, — расказаў нам кіраўнік прэс-цэнтра Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, — здарылася б трагедыя. Прычынай пажару з'явілася тое, што Антон у адсутнасць бацькоў знайшоў запалкі і пачаў забаўляцца з імі... Пра Аляксея ў школе кажуць добрыя словы. Сярэдні бал па прадметах у яго — сем. Хлапчук займаецца боксам, з'яўляецца членам Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## У БЕЛАРУСІ РЭЗКА ПАХАЛАДАЕ

**Аднак у гэту ноч тэрыторыя рэспублікі яшчэ застанецца пад уплывам павышанага атмасфернага ціску, таму ападкаў не чакаецца, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. Паводле слоў спецыяліста, тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.**

Заўтра, 3 красавіка, днём да тэрыторыі Беларусі наблізіцца атмасферны фронт, які рухаецца з поўначы Еўропы, таму па паўночна-заходняй палове краіны пройдзе невялікі кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра складзе ад 7 градусаў цяпла на поўначы да 15 градусаў вышэй за нуль на поўдні рэспублікі.

У сераду, 4 красавіка, услед за атмасферным фронтам у Беларусь рушаць халодныя паветраныя масы арктычнага паходжання. Рэзка пахаладае. Тэмпература паветра ў ноч на сераду, 4 красавіка, складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, на паўднёвым захадзе да плюс 3 градусаў. А ўдзень будзе ўсяго 1—6 градусаў цяпла.

У многіх раёнах уначы, а ўдзень пераважна па ўсходзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу.

Захаваецца халоднае надвор'е і ў чацвер, 5 красавіка. У гэты дзень па поўначы краіны чакаецца невялікі дождж. Уначы тэмпература паветра знізіцца да мінус 2—8 градусаў. Удзень будзе ад 3 да 8 градусаў цяпла. У Брэсцкай вобласці — да 10 градусаў вышэй за нуль.

У другой палове тыдня чакаецца няўстойлівы характар надвор'я. Месцамі, у асноўным па поўначы краіны, пройдуць ападкі — дождж з мокрым снегам. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны — ад мінус 3 градусаў да плюс 3 градусаў. Удзень будзе ад 5 да 10 градусаў цяпла. Толькі ў паўднёвых раёнах Беларусі паветра прагрэецца да плюс 13 градусаў. Такое ж надвор'е, паводле прагнозаў сіноптыкаў, чакаецца і ў нядзелю, 8 красавіка.

## ДРЭВА, ЯКОЕ ЎПАЛА НА ЛЭП, АБЫШЛОСЯ ЭНЕРГЕТЫКАМ У 5 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

**Старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў даручыў арганізаваць дакладнае расследаванне буйной энергетычнай аварыі, якая адбылася ў Мінску ў суботу.**

Як інфармаваў генеральны дырэктар РУП «Мінскэнерга» Васіль Бабей, 31 сакавіка ў 12.18 з-за падзення спілаванага дрэва на высакавольтную лінію электраперадачы па вуліцы Філімонава адбылося кароткае замыканне. У гэтым раёне Мінская лесапаркавая гаспадарка праводзіла высечку зялёных насаджэнняў. У выніку адразу на 8 падстанцыях сістэма не вытрымала перагрузкі і адключылася. Без электраэнергіі засталіся пяць раёнаў сталіцы — Заводскі, Цэнтральны, Ленінскі, Партызанскі і Першамайскі. У цэлым па горадзе па прычыне аварыі спажыванне электраэнергіі было зніжана на 10 працэнтаў.

Паводле яго звестак, ад электраэнергіі было адключана 936 жылых дамоў горада і 8 аб'ектаў, у тым ліку 1-я гарадская клінічная бальніца і Мінскі камбінат хлебапрадуктаў. На 14.40 было выканана падключэнне ўсіх адказных спажыўцоў. У дамах падача электраэнергіі была адноўлена да 16.40.

У выніку энергетычнай аварыі спажыўцам адпушчана на 64 тыс. кВт. гадз. менш электраэнергіі, у сувязі з чым прамыя страты энергасістэмы склалі каля 5 тыс. долараў. Аб гэтым паведамілі ў ДПА «Белэнерга».

**Кар. БЕЛТА.**

## НА ЎЧАСТКУ АЎТАДАРОГІ Р-28 АД ЗЯЛЁНАГА ДА ЗАСЛАЎЯ З 2 КРАСАВІКА ДА 31 КАСТРЫЧНІКА БУДЗЕ ПОЎНАСЦЮ ЗАКРЫТЫ РУХ

**На аўтадарозе Р-28 Мінск—Маладзечна—Нарач на ўчастку ад 19 км (пасля павароту на населены пункт Зялёнае) да 22,6 км (г. Заслаўе) з 2 красавіка да 31 кастрычніка 2007 года будзе поўнасцю закрыты рух аўтатранспарту. Аб гэтым паведамілі ў дэпартаменце «Белаўтадар» Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі.**

Закрыццё руху абумоўлена далейшай рэканструкцыяй дарогі Р-28, якая выклікана неабходнасцю вынасу падземных камунікацый, узвядзенню штучных збудаванняў (вадаправодных труб, падземных пешаходных пераходаў) і выканання земляных работ па змяненню геаметрычных параметраў дарогі.

Як паведамілі ў «Белаўтадары», транзітны рух транспарту, праезд да дачных кааператываў, размешчаных у гэтым накірунку, а таксама транспартная сувязь паміж гарадамі Мінск і Заслаўе з заходняга накірунку будзе забяспечвацца па аўтамабільных дарогах М-6 Мінск—Гродна і Р-65 Заслаўе—Дзяржынск—Возера, з паўночнага накірунку — па дарогах Р-58 Мінск—Калачы—Мядзел і Н-9031 Калодзішчы—Заслаўе.

Рух па дарозе, што вядзе да населенага пункта Зялёнае, у раёне якога размешчаны дзіцячыя аздараўленчыя лагеры і прафілакторыі, будзе ажыццяўляцца ў звычайным рэжыме. Таксама не абмяжоўваецца праезд з Мінска да населенага пункта Крыжоўка і дачных кааператываў, у асноўным размешчаных да 19 км аўтадарогі Р-28.

**Вольга СРЭДНЕВА, БЕЛТА.**

# ЗАКОНЫ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Навіцкага Г.В. на адкрыцці сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання 2 красавіка 2007 г.



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя журналісты і запрошаныя!

Сёння пачынае работу чарговая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання. У бліжэйшыя тры месяцы мы разгледзім неабходныя для грамадства законапраекты. Нам трэба будзе выпрацаваць новыя формы ўзаемадзеяння з органамі мясцовага самакіравання і развіваць міжпарламенцкае супрацоўніцтва.

Значнай палітычнай падзеяй міжсесійнага перыяду сталі выбары ў прадстаўнічыя органы мясцовай улады. Саветы дэпутатаў усіх узроўняў сфарміраваны ў правамочным складзе. Нававыбранаму дэпутацкаму корпусу трэба будзе рэалізаваць цэлы комплекс мераў, накіраваных на павышэнне статусу мясцовых Саветаў дэпутатаў і іх ролі пры вырашэнні надзённых праблем насельніцтва.

Трэба адзначыць, што члены Савета Рэспублікі актыўна ўключыліся ў работу па аказанню дапамогі дэпутатам мясцовых Саветаў дэпутатаў. З іх удзелам прайшлі амаль усе арганізацыйныя сесіі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў. У рэгіёнах адбыліся рабочыя сустрэчы парламентарыяў са старшынямі Саветаў дэпутатаў базавага і пярвічнага ўзроўняў. Трынаццаць членаў Савета Рэспублікі выбраны дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Асаблівую актуальнасць сёння набывае далейшае паглыбленне нашага ўзаемадзеяння з мясцовымі Саветамі дэпутатаў. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» Савету Рэспублікі рэкамендавана ўтварыць Савет па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання. У перспектыве гэты напрамак дзейнасці Савета Рэспублікі можа стаць адным з асноўных.

Галоўная задача гэтага Савета — праведзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў дзейнасці органаў мясцовага самакіравання. Гэта датычыцца і ўдасканалення дзеючага заканадаўства ў названай сферы.

З удзелам старшынь абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў у Савеце Рэспублікі было праведзена некалькі рабочых нарад па пытанню ўтварэння Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання. Нам удалося сфармуляваць яго асноўныя задачы і функцыі, выпрацаваць аптымальныя падыходы да яго структуры і персанальнага складу. Увесь пакет дакументаў аб утварэнні названага Савета, папярэдне ўзгоднены з адпаведнымі дзяржаўнымі органамі, сёння будзе ўнесены на ваш разгляд.

Паважаныя калегі!

У міжсесійны перыяд пастаянныя камісіі Савета Рэспублікі актыўна ўдзельнічалі ў разглядзе ўсіх праектаў законаў і падрыхтоўцы заўваг і прапаноў па іх. Большасць нашых паправак распрацоўшчыкамі законапраектаў улічана. Акрамя таго, была прааналізавана практыка прымянення Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян». Адпаведная інфармацыя накіравана ў Нацыянальны цэнтр законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

# У ЗАКАНАТВОРЧАСЦІ НЕ МОЖА БЫЦЬ ДРОБЯЗЯЎ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Канаплёва У.М. на адкрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання 2 красавіка 2007 г.



Паважаныя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў!

Паважаныя члены Урада, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, запрошаныя!

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння, 2 красавіка 2007 года, адкрываецца шостая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

У міжсесійны перыяд праведзена грунтоўная падрыхтоўчая работа. Удзел у выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, кантакты з выбаршчыкамі, работа ў пастаянных камісіях Палаты прадстаўнікоў далі магчымасць нам яшчэ раз зверыць планы, убачыць, наколькі наша дзейнасць адпавядае чаканням грамадства.

Галоўны вывад — час вызначэння агульных падыходаў прайшоў. Ідзе карпатлівая, метадычная работа па заканадаўчаму забеспячэнню канкрэтных задач пабудовы дзяржавы для народа. Дробязяў тут няма. Кожнае пытанне важнае — ці гэта дзяржаўнае будаўніцтва, ці павышэнне эфектыўнасці эканомікі, ці вырашэнне надзённых праблем грамадзян.

Усяго ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца 108 пытанняў, 96 з іх уключаны ў графік падрыхтоўкі для разгляду на сесіі. Поўнасцю падрыхтаваны 50 пытанняў.

Самым аб'ёмным з'яўляецца блок сацыяльных пытанняў. І гэта заканамерна: чалавек, яго патрэбы сталі зыходным пунктам усёй заканатворчай дзейнасці.

І на першым месцы — пытанні захавання і развіцця чалавечага патэнцыялу. У ходзе сесіі мы разгледзім комплекс мераў па паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі. У прыватнасці, плануецца заканадаўча замацаваць павелічэнне памераў аднаразовай дапамогі пры нараджэнні першага дзіцяці да 5, а пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — да 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму.

Прадоўжыцца работа па развіццю заканадаўства аб правах дзіцяці. Будуць разгледжаны праекты законаў па пытаннях узмацнення дзяржаўнай абароны дзяцей у няўдалых сем'ях, усынаўлення, спагнання аліментаў.

Пільнай увагі патрабуе даволі складаны законапраект аб вышэйшай адукацыі. Яго даўно чакаюць нашы ВНУ, і тут трэба ставіць кропку.

Сацыяльная накіраванасць веснавой сесіі праяўляецца і ў значнай карэкціроўцы працоўнага заканадаўства. Плануецца разгледзець комплексныя змяненні ў Працоўны кодэкс, прыняць законапраект «Аб ахове працы». Сярод значных новаўвядзенняў — абмежаванне рабочага часу, удасканаленне парадку прадастаўлення водпускаў. З уведзеннем новых заканадаўчых нормаў працягласць рабочага часу пры зменнай рабоце, а таксама пры рабоце, на якой вядзецца падсумаваны ўлік рабочага часу, будзе абмежавана 12 гадзінамі, а наймальнік будзе абавязаны ісці насустрач інтарэсам сям'і і з улікам пажаданняў бацькоў прадастаўляць водпуск па догляду дзіцяці бацьку замест маці.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

# ВЫСОКАЕ НЕБА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ



Вербная нядзеля ў Лагойску.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Прэзідэнт Расіі павіншаваў Аляксандра Лукашэнку

**Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку з нагоды Дня яднання народаў Беларусі і Расіі павіншаваў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Гэты дзень сімвалізуе гістарычную роднасць нашых народаў», — гаворыцца ў віншаванні. Уладзімір Пуцін выказаў перакананасць, што нарошчванне ўзаемавыгаднага, прагматычнага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах і перш за ўсё — у эканамічнай, можа ўнесці важкі ўклад у развіццё інтэграцыйных працэсаў, рэальна садзейнічаць павышэнню ўзроўню дабрабыту грамадзян дзвюх краін.

# На палях механізатараў чакае накрыты беласнежным абрусам стол

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

**Кожны кіраўнік ведае, што для таго, каб стаць паспяховым, трэба трымацца пэўных правілаў. Па-першае, падабраць каманду прафесіяналаў, так званых «кіроўцаў», якія могуць прапанаваць і выпрацаваць і ідэі, і шляхі іх рэалізацыі. Па-другое, выхаваць, выпесціць і ўсяляк падтрымліваць «выканаўцаў» — тых, на чые плечы кладзецца работа па ажыццяўленню рашэнняў. Паміж гэтымі дзвюма групамі павінна ўсталявацца непарыўная сувязь, пры якой, нібыта ў ланцугу, кожнае звяно ўзаемадзейнічае з суседнім. І тады любая справа будзе прыносіць найбольшы плён.**



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Каманднае пачуццё, або, як кажуць зараз, прынцыпы карпаратыўнага духу з усіх сваіх бакоў праяўляюцца і ў час пасяўной кампаніі. Праца хлебароба складаная, у гарачую пару — на пасяўной, і падчас уборачнай — людзям дапамагае іх асабісты энтузіязм і працавітасць, пачуццё «суседскага локця». Калі пачынаецца сяўба, у работу ўключаюцца і дзяржаўныя органы, прафсаюз, інспекцыя па ахове працы, службы тэхнічнага забеспячэння. У Чэрвеньскім раёне, напрыклад, падмурак пад будучы ўраджай закладваецца амаль усімі галінамі выканаўчай улады.

— Эканамічная гарантыя вытворчасці, у тым ліку і сельскагаспадарчай прадукцыі, залежыць ад згуртаванасці калектыву. Належная арганізацыя працы — лепшы залог прыбытку. Добрыя працаўнікі — наша эліта, якую разумны кіраўнік павінен усяляк падтрымліваць і дапамагаць ёй. Сёлета ў раёне прыйшла новая тэхніка, пасяўная пачалася арганізавана, і зараз усё залежыць не толькі ад механізатараў, але і ад таго, у якіх умовах яны працуюць, як арганізавана іх дзейнасць. Стварыць усё неабходнае для таго, каб падтрымаць, зацікавіць людзей — наша задача, — расказаў старшыня Чэрвеньскага райвыканкама Іван Муха. — Механізатары прайшлі навучанне на замежных «Фэндтах». Некаторыя гаспадаркі раёна атрымалі ліцэнзію на працаўладкаванне замежных грамадзян. Калі не хапае рук, да нас прыязджаюць працаваць з суседніх краін.

Адказнасць за стварэнне патрэбных умоў у гарачы час веснавых работ кладзецца на ідэалагічных работнікаў — і гэта тэндэнцыя апошніх гадоў, ад абласнога ўзроўню і да штатнага ідэолага сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва. Гэтыя людзі таксама, як і механізатары, праводзяць у полі ў гарачую пару асноўную частку свайго працоўнага часу. Іх задача — падтрымаць людзей, маральна заахвоціць да працы. На першы погляд, псіхалагічная падтрымка можа падацца нечым неабавязковым, несур'ёзным. Аднак у апошнія гады арганізацыя працэсу вытворчасці прадукту патрабуе не толькі матэрыяльных укладанняў — мадэрнізацыі, напрыклад. Ва ўсім свеце набірае сілу прынцып так званага «нематэрыяльнага» стымулявання работнікаў, для таго, каб ланцуг «кіраўнік»—«выканаўца» спрацоўваў на сто працэнтаў.

— Мы шмат намаганняў прыкладаем для таго, каб механізатарам было прыемна працаваць. Для гэтага ўжываем сістэму заахвочвання. Станоўчы псіхалагічны настрой чалавека — гэта самае галоўнае ў паспяховай дзейнасці. Акрамя таго, што мы арганізоўваем спаборніцтвы і ўзнагароджваем лепшых не толькі па выніках пасяўной, але і падчас яе, рэалізоўваем некалькі новых ідэй, — кажа начальнік аддзела ідэалагічнай работы Чэрвеньскага райвыканкама Галіна Гамеза. — У школах уручаем падзячныя пісьмы дзецям механізатараў. Уявіце, які гэта гонар для школьніка, калі пры ўсім класе яму выказваюць падзяку за працу таты. А як хораша адчувае сябе бацька, які прыходзіць пасля напружанай працы дадому і бачыць вочы, якія глядзяць на яго з гонарам. Мы ўлічваем і тое, што галава сям'і сыходзіць з дому ранічкай і прыходзіць з працы вечарам. Ён павінен быць упэўнены ў тым, што ў яго доме ўсё добра, што яго надзейны «тыл» — жонка спраўляецца па гаспадарцы без яго. Пісьмы падзякі, падарункі за добрую працу мужа атрымліваюць і жонкі механізатараў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Школа падаткаплацельшчыка

# Якія прэміі не абкладаюцца падаткам?

**Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння нашаму выданню адказвае старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах Аляксандр ЗЯЛЕЎСКІ.**

***— Ці льгатуецца матэрыяльная дапамога работнікам прадпрыемства, якія вярталіся на свае месца работы пасля службы ва Узброеных Сілах?***

**Анатоль ВІКША**, *г. Маладзечна.*

— Такая матэрыяльная дапамога не абкладаецца падаткам у межах 150 базавых велічынь як даход, які не з'яўляецца ўзнагародай за выкананне працоўных або іншых абавязкаў.

***— Мая сястра, грамадзянка Беларусі, якая працуе за мяжой, дасылае мне грошы для будаўніцтва жылля. Ці абкладаюцца гэтыя сродкі падаходным падаткам? Якія звесткі мне неабходна падаць у падатковую інспекцыю?***

**Алена КАРПУК**, *г. Валожын.*

— Згодна з Законам «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў», не лічацца аб'ектам падаткаабкладання даходы, атрыманыя ад асобаў, што знаходзяцца паміж сабою ў адносінах блізкай сваяцкасці або сваяцтва. У гэтым выпадку не трэба накіроўваць у падатковы орган падатковую дэкларацыю (разлік). Аднак па патрабаванню падатковага органа неабходна будзе пацвердзіць права на такую льготу.

***— Мы з жонкай разведзеныя. У нас ёсць дачка 11 гадоў. Так здарылася, што аліменты афіцыйна я не плачу. Былой сям'і я дапамагаю інакш. Ці маю я права на падатковы вылік у памеры дзвюх базавых велічынь і якія дакументы для гэтага трэба прынесці па месцы працы?***

**Ігар Ш.**, *Магілёўская вобласць.*

— Стандартны падатковы вылік у памеры дзвюх базавых велічынь на кожнае дзіця да 18 гадоў і (або) утрыманца прадастаўляецца за кожны месяц падатковага перыяду абодвум бацькам, у тым ліку асобам, якія скасавалі шлюб. Падставай для гэтага могуць з'яўляцца даныя аддзела кадраў або бухгалтэрыі (пашпарт, звесткі аб наяўнасці дзяцей у фізічнай асобы), а пры адсутнасці такой інфармацыі — копіі пасведчання аб нараджэнні дзіцяці. Гэты падатковы вылік на працягу каляндарнага года даецца плацельшчыку наймальнікам толькі па месцы асноўнай працы.

***— Летась у кастрычніку ў сувязі з 55-годдзем мне на працы выплацілі прэмію ў памеры 560 тысяч рублёў. З гэтай сумы быў утрыманы падаходны падатак у памеры 9 працэнтаў. Я з гэтым часткова не згодны. У якіх выпадках прэміі да юбілейных дат абкладаюцца падаткам?***

**Генадзь ПІСКУН,** *Мінская вобласць.*

— Прэміі да юбілейных дат не абкладаюцца падаходным падаткам, калі сума іх складае да 150 базавых велічынь. Разам з тым тут ёсць адна ўмова: калі прэмія да юбілейнай даты адначасова з'яўляецца платай за выкананне працоўных абавязкаў, г.зн. калі ў загадзе агавораны дзве ўмовы прэміявання — юбілейная дата і, напрыклад, высокія паказчыкі ў працы, то ў гэтым выпадку такая плата падлягае абкладанню падаходным падаткам як іншая прэмія, якую мы атрымліваем за выкананне сваіх працоўных абавязкаў.

***— Летась я атрымала платную першую вышэйшую адукацыю за кошт сродкаў прадпрыемства. Пасля заканчэння ВНУ на месца працы па дагавору я не прыбылы і вярнула прадпрыемству грошы, якія былі накіраваны на маё навучанне. Ці маю я зараз права на вылік падаходнага падатку?***

**Алена ЛАГУН,** *г. Брэст.*

— Права на вылік вы не маеце. У вашым выпадку падатковы вылік даецца толькі на суму адукацыйных паслуг згодна з дагаворам, які быў складзены з установай адукацыі, і дакументаў, паводле якіх ажыццяўлялася аплата адукацыйных паслуг. У вашым выпадку і дагавор на адукацыйныя паслугі заключала прадпрыемства і выдаткі па іх аплаце несла таксама прадпрыемства.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

Уладзімір ПАТУПЧЫК:

# «ДОБРУЮ РАБОТУ МОЖА ЗНАЙСЦІ ТОЛЬКІ ПРАФЕСІЯНАЛ. І ПРЫЧЫМ — НЕЗАЛЕЖНА АД УЗРОСТУ»

Спецыяльна для «Звязды»



**Даходы, дэмаграфія і нават узровень злачыннасці — у любым выпадку ўсё гэта мае прамое дачыненне да сітуацыі на рынку працы. Таму тэма працаўладкавання з'яўляецца актуальнай заўсёды. Між тым, што плануецца зрабіць для зніжэння паказчыкаў беспрацоўя ў бліжэйшы час, як вырашыць «традыцыйную» праблему пошуку свабодных месцаў для жанчын і моладзі, у чым перавагі і недахопы поўнай лібералізацыі рынку працы ўнутры краіны і, у рэшце рэшт, як працягнуць у айчынную эканоміку «неактыўную» частку насельніцтва? Аб усім гэтым і іншым — наша сённяшняя гутарка з міністрам працы і сацыяльнай абароны Беларусі Уладзімірам Мікалаевічам ПАТУПЧЫКАМ.**

***— Як вядома, Беларусь мае ці не самы нізкі ўзровень беспрацоўя сярод усіх краін Еўропы. Такім чынам, ці можна весці гаворку аб тым, што на айчынным рынку не засталося якіх-небудзь значных праблем?***

— Адразу падкрэслю, што ў любой сітуацыі пад рынкавай эканомікай маецца на ўвазе канкурэнцыя і натуральны рух працоўнай сілы. Дастаткова заўважыць, што толькі за мінулы год з самых розных прычын (і, як правіла, з прычыны жадання атрымліваць большую зарплату ці палепшыць умовы працы) у краіне звольніліся адразу 864 тыс. чалавек. Таму весці гаворку аб тым, што калі-небудзь атрымаецца зняць усе пытанні з занятасцю «раз і назаўсёды», проста немагчыма. Як, дарэчы, нерэальна ва ўмовах канкурэнцыі і цалкам ліквідаваць беспрацоўе як з'яву. Галоўная мэта тут у іншым — звесці беспрацоўе да мінімальна дапушчальнага паказчыку. І тут мы на самай справе можам адзначыць пэўныя поспехі.

У пачатку сакавіка на ўліку ў службах занятасці нашай краіны знаходзілася 53 тыс. чалавек, што адпавядала 1,2 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва нашай краіны. Гэты паказчык быў самым нізкім у параўнанні як з Еўропай, так і дзяржавамі былога СССР. Да прыкладу, у Расійскай Федэрацыі ўзровень беспрацоўя вагаецца ў межах 1,9—2,4, а ў Літве — стабільна перавышае адзнаку ў 3 працэнты. Пры гэтым падобная акалічнасць мае некалькі тлумачэнняў. Так, з аднаго боку даводзіцца канстатаваць, што ажыўленне айчыннай эканомікі вядзе да павышэння попыту на працоўную сілу і, адпаведна, да росту колькасці вакансій. А з іншага боку нельга не заўважыць: стабільнасць рынку працы падтрымліваецца актыўнымі мерамі дзяржавы — укладаннем значных сродкаў у стварэнне новых працоўных месцаў, падтрымку прадпрымальніцтва, прафесійнае навучанне і перанавучанне беспрацоўных, арганізацыю пераездаў беспрацоўных на новыя месцы жыхарства. Прычым гэта практыка працягнецца і надалей, што дазволіць пазбегнуць больш-менш значных узрушэнняў.

Разам з тым казаць, што з занятасцю няма ніякіх пытанняў, вельмі заўчасна. Нягледзячы на тое, што ў студзені-лютым летась узровень беспрацоўя ў Беларусі складаў 1,7 працэнта, сцвярджаць, што мы сталі сведкамі рэзкага паляпшэння сітуацыі, не выпадае. Цяперашняе зніжэнне тлумачыцца ў тым ліку прыняццем новага заканадаўства і змяненнем умоў рэгістрацыі. Нагадаю, што Законам «Аб занятасці насельніцтва» ў рэдакцыі 2006 года беспрацоўныя, якія накіроўваюцца на прафесійнае навучанне на дзённую форму, лічацца занятымі і знімаюцца з уліку. У сваю чаргу гэта зменшыла агульны паказчык беспрацоўя прыкладна на 0,3—0,4 працэнта. Такім чынам, фактычна ўзровень беспрацоўя аказаўся каля ранейшай адзнакі, а значыць, праблема працаўладкавання застаецца.

Да таго ж нельга не заўважыць, што занятасць заўсёды мае рэгіянальную спецыфіку, і менавіта «праблема рэгіёнаў» з'яўляецца ці не самай вострай. Так, па выніках мінулага года ўзровень беспрацоўя зменшыўся практычна паўсюль, за выключэннем Пінскага і Асіповіцкага раёнаў. І ў той жа час на карце краіны застаецца шэраг па-сапраўднаму «балючых кропак» — гарадоў і раёнаў, дзе ўзровень беспрацоўя адчувальна перавышае сярэдні па краіне паказчык. У ліку гэтых «кропак» варта ўзгадаць Ганцавічы і Іванава, Паставы і Новалукомль, Краснапольскі і Рэчыцкі раёны. А ўсяго ў дзяржаўную праграму занятасці на гэты год патрапілі 29 рэгіёнаў. І выправіць становішча тут прынамсі да 2010 года — задача нумар адзін.

***— Традыцыйна няпростай катэгорыяй на рынку працы лічацца жанчыны. Аднак ці не здаецца вам, што адной з прычын падобнага становішча з'яўляецца «занадта вялікая колькасць працоўных і сацыяльных ільгот», што ў сваю чаргу «палохае» многіх наймальнікаў падчас прыёму жанчыны на работу?***

— Сапраўды, падыход наймальнікаў да жанчын неадназначны, у прыватнасці, ужо пры прыёме на работу многія загадзя «пралічваюць варыянты» аплаты «дэкрэтнага» водпуску, прадастаўлення дадатковых «бальнічных» у сувязі з хваробай дзяцей ці дадатковых выхадных маці-адзіночцы. Але ў той жа час абысціся без падобных гарантый, якія ў нечым зніжаюць ступень канкурэнтаздольнасці маці, проста немагчыма. Бо ў любым выпадку асноўная функцыя жанчыны — нарадзіць і выхаваць дзіця.

Аднак таксама нельга не заўважыць, што «льготамі» жанчыны ў асноўным карыстаюцца толькі ў фертыльным узросце. Далей жа ніякіх пераваг па сутнасці няма. Аднак якраз тут і становіцца відавочнай ці не самая вялікая праблема. Знайсці месца жанчыне ў больш сталым узросце яшчэ больш складана, і галоўным чынам з-за спецыфікі рынку працы, які ў асноўным арыентуецца на «мужчынскія» прафесіі. Прычым гэта — праблема не толькі Рэспублікі Беларусь. Падобны малюнак назіраецца практычна ва ўсім свеце. Што ж да агульнапрынятага выйсця, то ў якасці яго разглядаецца варыянт «гнуткай занятасці» ці занятасці на ўмовах не фіксаванага працоўнага дня. І, дарэчы, даволі красамоўны факт: у краінах Еўрасаюза на такіх умовах занята амаль трэць жанчын і толькі 7,7 працэнта — мужчын.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.04.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 143,00 |
| 1 еўра | 2 861,23 |
| 1 латвійскі лат | 4033,12 |
| 1 літоўскі літ | 828,79 |
| 1 чэшская крона | 102,28 |
| 1 польскі злоты | 741,60 |
| 1 расійскі рубель | 82,44 |
| 1 украінская грыўня | |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 25,9947 |
| 10 UAH | 51,3658 |
| 1000 BYR | 12,1170 |
| EUR | 34,7107 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 2.04.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Конкурс

# Вызначаны самыя ўдачлівыя паляўнічыя сезона

**Міністэрствам лясной гаспадаркі падведзены вынікі чаргавага штогадовага рэспубліканскага конкурсу па здабычы непажаданых відаў дзікай жывёлы — ваўка, звычайнай лісы, янотападобнага сабакі — сярод брыгад і індывідуальных паляўнічых.**

Усяго за мінулы час у цэлым па краіне было здабыта, у тым ліку і ўдзельнікамі конкурсу, 615 асобінаў ваўка, 28 040 — звычайнай лісы і 6869 — янотападобнага сабакі. Што датычыцца конкурсу, дык, згодна з інструкцыяй па яго правядзенню, за здабычу звычайнай лісы налічваўся 1 бал, дарослага ваўка — 2 балы, ваўчаняці да 4 месяцаў — 1 бал і г.д.

Па здабычы ваўка сярод брыгад паляўнічых першае месца па выніках конкурсу дасталося брыгадзе ўстановы «Нараўлянская раённая арганізацыйная структура» (РАС) Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» (РДГА «БТПР»), у актыве якой было 60 балаў. Другое і трэцяе месцы дасталіся, адпаведна, брыгадам дзяржаўнай лесагаспадарчай установы (ДЛГУ) «Васілевіцкі лягас» (56 балаў) і ўстанове «Брагінская РАС» РДГА «БТПР» (44 балы). Сярод індывідуальных паляўнічых першае месца па здабычы ваўка з 26 баламі заняў Фёдар Бабронак з установы «Брагінская РАС» РДГА «БТПР». На другім месцы — Аляксей Гурын (21 бал) з ДЛГУ «Петрыкаўскі лягас», на трэцім — Віктар Кажадуб (20 балаў) з установы «Калінкавіцкая РАС» РДГА «БТПР».


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сярод брыгад паляўнічых па здабычы лісы і янотападобнага сабакі найбольшая ўдача і, адпаведна, першае месца ў конкурсе дасталіся брыгадзе ДЛГУ «Асіповіцкі доследны лягас» (353 балы). Другое прызавое месца заняла брыгада з установы «Гомельская РАС» РДГА «БТПР» з вынікам 116 балаў. На трэцім месцы — ДЛГУ «Лельчыцкі доследны лягас» (109 балаў). У індывідуальным заліку па здабычы лісы і янотападобнага сабакі найлепшы вынік — 187 балаў — паказаў Віктар Рымановіч з ДЛГУ «Гарадоцкі лягас». 174 балы і другое месца — у Сяргея Новікава з установы «Гарадоцкая РАС» РДГА «БТПР». Трэцяе месца заняў Аляксандр Шапетка з ЗАТ «Асотна» (131 бал).

Усе ўдзельнікі конкурсу атрымаюць грашовыя ўзнагароджанні ў залежнасці ад колькасці здабытай дзікай жывёлы непажаданых відаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пытальнік

# Высакавольтная лінія электраперадач на здароўе не ўплывае

**Дзевяць гадоў таму ўздоўж маёй сядзібы правялі высакавольтную лінію з напружаннем 10 кВ. З тых часоў, асабліва пасля ночы, у мяне баліць галава, павышаецца ціск. Мне думалася, што гэта ад узросту (мне 56 гадоў), але калі прыязджаюць з горада дзеці, унукі, у іх пасля ночы назіраецца тое ж самае. Таму адкажыце, калі ласка, на маё пытанне: на якой адлегласці ад жылых памяшканняў павінна размяшчацца высакавольтная лінія? Як яна можа ўплываць на здароўе чалавека, калі размешчана ад дома на адлегласці 4 метры? (У дадатак да ліста быў прыкладзены падрабязны план-схема мясцовасці з указаннем адлегласці ад высакавольтнай лініі, размеркавальнай станцыі да жылых і гаспадарчых пабудоў, што належаць заяўніцы. — Рэд.)**

**Марыя Сідараўна БАНЬ,**
*в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна.*

Атрымаўшы ліст нашай чытачкі з амаль 30-гадовым, як яна сама напісала, стажам, мы першай справай патэлефанавалі ў Салігорскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Нам паведамілі, што ўсё неабходнае абсталяванне для правядзення патрэбных замераў у іх маецца, і яны могуць на месцы праверыць выкладзеную жанчынай інфармацыю. Неўзабаве мы атрымалі афіцыйны адказ на наш запыт. Ён складаецца з дзвюх частак — агульнай і канкрэтнай, што датычыцца вышэйзгаданай сітуацыі. Паколькі лісты і званкі чытачоў адносна магчымага ўплыву на здароўе чалавека ад высакавольтных ліній электраперадач не такія ўжо рэдкія ў рэдакцыйнай пошце, ёсць сэнс прывесці адказ цалкам.

«У мэтах абароны насельніцтва ад уздзеяння электрычнага поля, што ствараецца паветранымі лініямі электраперадач, устанаўліваюцца санітарна-ахоўныя зоны (тэрыторыі ўздоўж трасаў ліній электраперадач, на якіх абмяжоўваюцца ці забараняюцца пэўныя віды дзейнасці і пражыванне). Памеры санітарна-ахоўных зон устанаўліваюцца ў залежнасці ад напружання высакавольтнай лініі электраперадач у адпаведнасці з раздзелам 4 Санітарных правілаў і нормаў Рэспублікі Беларусь № 10-5 «Санітарная класіфікацыя прадпрыемстваў, збудаванняў і іншых аб'ектаў. Санітарна-ахоўныя зоны», і карэктуюцца інструментальнымі вымярэннямі напружанасці электрычнага поля. Крытэрыем для вызначэння санітарна-ахоўнай зоны і карэктавання яе памераў з'яўляецца напружанасць электрычнага поля ў 1 кВ/м. Паветраныя лініі электраперадач, якія па сваіх тэхнічных характарыстыках не могуць ствараць напружанасць электрычнага поля ўздоўж трасы размяшчэння 1 кВ/м і больш, не патрабуюць арганізацыі санітарна-ахоўных зонаў і не маюць гігіенічнага значэння. Гэта абумоўлена тым, што напружанасць электрычнага поля 1 кВ/м і менш не аказвае неспрыяльнага ўздзеяння на арганізм чалавека на працягу ўсяго яго жыцця. Да такіх ліній электраперадач адносяцца і паветраныя лініі з напружаннем 10 кВ».

Далей паведамляецца аб выніках інструментальных вымярэнняў напружанасці электрычнага поля, якія праводзіліся ў жылых памяшканнях дома, што належыць заяўніцы, і на тэрыторыі двара, які непасрэдна прылягае да паветранай лініі электраперадач з напружаннем 10 кВ.

«У выніку праведзеных вымярэнняў устаноўлена, што напружанасць электрычнага поля ў жылых памяшканнях і ў двары дома не перавысіла 0,002 кВ/м, што значна менш за 1 кВ/м. Таму паветраная лінія электраперадач з напружаннем 10 кВ у працэсе эксплуатацыі не можа аказваць неспрыяльнага ўплыву на здароўе жыльцоў дома.

Таксама варта дадаць, што згодна з ДАСТ 12.1.051-90 «Сістэма стандартаў бяспекі працы. Электрабяспека. Адлегласці бяспекі ў ахоўнай зоне ліній электраперадачы напружаннем звыш 1000 В», для паветраных ліній электраперадачы з напружаннем да 20 кВ устаноўлена ахоўная зона ў 10 метраў. У адпаведнасці з Правіламі ўладкавання электраўстановак, устаноўлена мінімальная адлегласць ад крайняга провада паветранай лініі электраперадач 10 кВ да бліжэйшых жылых пабудоў — не менш за 3 метры. Фактычная адлегласць складае не менш за 4 метры (дарэчы, гэтую ж лічбу — 4 метры — пазначыла на сваім плане-схеме і сама чытачка. — Рэд.). Кантроль за захаваннем мінімальных адлегласцяў да жылых пабудоў, а таксама над дзейнасцю і правядзеннем работ у ахоўнай зоне ажыццяўляе арганізацыя, якая эксплуатуе лінію электраперадач».

Рэха публікацыі

# «ВУЧЫЦЦА З УСМЕШКАЙ СПРАЎЛЯЦЦА З ЖЫЦЦЁВЫМІ ПЕРАШКОДАМІ...»



## Новыя парады горацкага біяэнергатэрапеўта Валянціна Таранава

***(Працяг. Пачатак у нумары за 31 сакавіка.)***

2. Шмат было зваротаў бацькоў наконт **апатыі да жыцця і дэпрэсіі ў дарослых дзяцей.** У асноўным гэта датычылася маладых жанчын 23—26 гадоў. Адкуль у такім узросце глыбокае раўнадушша да жыцця?

— Я перагледзеў шмат літаратуры і прыйшоў да высновы, што праблема звязана якраз з узростам, — тлумачыць Валянцін Мікалаевіч. — Справа ў тым, што ў гэтыя гады прырода ўжо дыктуе сваё і прымушае дзяўчыну думаць аб каханні і прадаўжэнні роду. На гэта штурхае мозг, свядомасць, а таксама і эндакрынная сістэма. А калі вырашэння гэтай праблемы няма, узнікае псіхаэмацыйнае напружанне.

Асноўная частка маладых жанчын, бацькі якіх звярнуліся па дапамогу да біяэнергатэрапеўта, не былі замужам. Адсутнасць рэальных перспектыў і дакладных шлюбных планаў прывялі да апатыі і дэпрэсіі, лічыць Таранаў. І заўважае, што ўзнікае і зваротная рэакцыя: у такім настроі цяжка знайсці сабе партнёра.

— Іншая частка — гэта маладыя жанчыны, якія выйшлі замуж, — працягвае лекар. — Аднак з размоў я пераконваўся, што поўнага шчасця ў сем'ях няма. Затое ёсць шкадаванне аб спешным рашэнні. І дыскамфорт з гэтай нагоды ўводзіў маладых жанчын у стан дэпрэсіі. Тут, як і ў першым выпадку, знікала бачанне перспектывы. Яны проста не разумеюць, як ім жыць далей.

**— Вы змаглі дапамагчы?**

— Я спрабаваў уздзейнічаць біяэнергетычнымі метадамі карэкцыі, — адказвае Валянцін Мікалаевіч. — Каб чалавек пераацаніў жыццёвыя каштоўнасці і зразумеў, што галоўная з іх — гэта само жыццё. З кім ісці і куды — гэта другасная задача, і пачынаць гэты паход трэба з належнай самаацэнкі. Пачуццё ўпэўненасці ў сабе і сваіх сілах павінна быць у кожнага чалавека. Ён павінен дакладна разумець, што знаходзіцца на вяршыні «піраміды» гэтага жыцця, і ўвесь свет існуе, у пэўнай ступені, для яго. Астатняе — не так важна. Практычна чалавека лёгка можна перабудаваць, калі працэс не зайшоў далёка. І ў асноўным вынік быў станоўчы.

3. Асобны блок пытанняў — **праблема астэахандрозаў і парушэнняў кровазвароту ў галаўным мозгу.**

— Праблемы кровазвароту ў галаўным мозгу часта звязваюць са станам сасудаў, атэрасклерозам, дыябетам і іншымі цяжкімі хваробамі, але мала хто ўлічвае такі на першы погляд банальны фактар, як астэахандроз, — гаворыць Валянцін Мікалаевіч. — Пазванковыя артэрыі з розных прычын могуць быць злёгку прыціснуты, і з-за змяншэння крыватоку пачынаюцца праблемы.

Што рабіць у такім выпадку? Папершае, трэба непазбежна рабіць карэкцыю пазванкоў у спецыяліста. Таранаў раіць у такім выпадку звяртацца не да выпадковых людзей, а да прафесіяналаў з добрай рэпутацыяй. Бо пазваночнік — гэта зона, якая можа быць лёгка траўмавана. Па-другое, патрэбен масаж варатніковай зоны. Прычым гэта можна рабіць дома: адзін аднаму сваякі могуць размінаць мышцы шыйнага аддзела. Гэта даволі проста. І такім чынам, вучыць лекар, можна аднавіць кровазварот галаўнога мозгу і пазбавіцца галавакружэнняў, млоснасці і нават страты прытомнасці. Калі справа ў прыціснутасці пазванковых артэрыяў. Калі прычыны іншыя, трэба лячыцца.

4. **Дзіцячы энурэз.** Лекар лічыць: тут трэба шукаць прычыну хваробы. Прычына можа быць фізіялагічнага характару: запаленчы працэс, праблемы страўнікавага тракта і іншыя.

— Але асноўная маса прычын дзіцячага энурэзу — псіхаэмацыйная перагрузка, — лічыць Валянцін Мікалаевіч. — З вопыту маёй лекарскай практыкі, стрэс, як правіла, узнікае, калі малога аддаюць у дзіцячы садок, а потым усё яшчэ ўзмацняецца ў школе.

На жаль, жыццё сучаснага чалавека такое, што бацькам трэба працаваць, каб зарабляць на хлеб надзённы. І дзіця няма каму дагледзець. Таму з малых гадоў яго даводзіцца аддаваць у дзіцячы садок. Звычайна гавораць, што чым раней аддалі дзіця ў калектыў, тым хутчэй яно адаптуецца да асяроддзя. І чым болей ён будзе знаходзіцца, умоўна кажучы, у натоўпе, тым лягчэй яму будзе потым у жыцці. Але Таранаў такой высновае не давярае.

— Тут яшчэ шмат пытанняў і пярэчанняў, — тлумачыць ён сваю пазіцыю. — А чаму так цяжка адаптавацца ў жыцці выхаванцам дзіцячых дамоў? Яны з маленства ў калектыве, але потым іх даводзіцца ледзь не за руку вадзіць некалькі гадоў, каб яны сталі дарослымі з пункту гледжання грамадства. Так што гэта сфера яшчэ не вывучана. А я хачу звярнуць увагу, што і ў дзікай прыродзе, і ў гісторыі чалавека малое дзіця ніколі рэзка не кідалі ў самастойнасць. Яно знаходзілася ў маленькай сямейнай ячэйцы, і ўваходжанне ў соцыум адбывалася плаўна, нетаропка. Каб нервовая сістэма дзіцяці, яго псіхіка паспявалі адаптавацца.

А мы сёння аддаём у калектыў з некалькіх дзесяткаў чалавек малога, якому 2 гады і які хваравіта рэагуе не толькі на зносіны з «супляменнікамі», але і на элементарны шум. І хоць гэтую сітуацыю немагчыма змяніць пры нашым ладзе жыцця, я ўсё ж раю бацькам як мага больш часу знаходзіцца побач са сваім дзіцем. Дзіця павінна дыхаць у адным рытме з маці і быць побач з ёй, асабліва да 3 гадоў.

У выпадку энурэзу Валянцін Мікалаевіч настойліва раіць не сварыцц;а на дзіця за гэта — страх толькі паглыбляе праблему. Не трэба таксама «суцяшаць» яго падрыхтоўкай на ноч запаснога камплекта бялізны, бо гэтым нібыта праграмуецца начное здарэнне. Лекар раіць не заўважаць хваробу, не канцэнтраваць на ёй увагу ў сям'і. І патлумачыць дзіцяці, што гэта не сур'ёзная праблема і ўсё міне.

А карэктаваць працэс можна прыёмам вадкасці — бліжэй да вечара меней піць. Не пашкодзіць у такой сітуацыі і лыжачка мёду нанач. А таксама Таранаў раіць за некалькі гадзін да сну рабіць лёгкі масаж нізу пазваночніка, і лепей за ўсё — рукамі маці, якія прынясуць добрую энергетыку любові.

— Мацярынскія рукі — гэта лепшая біякарэкцыя, асабліва з ласкавым словам, якая адцягне ўвагу ад праблемы, — гаворыць ён. — І памятайце, энурэз — гэта не самая вялікая хвароба. Канешне, ёсць дыскамфорт, але катастрофы тут няма. Як правіла, перарастанне адбываецца да 12—14 гадоў.

5. У тэлефанаваннях людзей узнімалася таксама праблема **алкагалізму**.

— Канешне, у асноўным звярталіся маці з простым пытаннем «Што рабіць?», але адказаць на яго цяжка, — расказвае Валянцін Мікалаевіч. — «У сына трагедыя, сышла жонка, сам співаецца...» Тыповая гісторыя. Але размовы пра бытавое п'янства — гэта, на мой погляд, спрашчэнне праблемы і ненавуковы падыход. Клетка арганізма выпрацоўвае этылавы спірт і таксама яго спажывае. Пры адмоўным балансе чалавек мае патрэбу ў спажыванні спіртных напояў. Таму частка алкаголікаў зведвае прыроджаную залежнасць да спірту. І, дарэчы, чым большыя фізічныя нагрузкі, а таксама нагрузкі на мозг, тым большая патрэба ў этылавым спірце. Напрыклад, партовыя грузчыкі заўсёды пілі бязбожна, а практычна ўсе геніі былі алкаголікамі.

Калі гэта проста звычка, бытавое п'янства, то павінны працаваць фактары стрымання: сям'я, грамадства, медыцына. Але, на жаль, не кожнага п'яніцу можна вывезці з залежнасці, нават медыкаментамі, прызнае лекар.

— Я спрабаваў уздзейнічаць метадамі біяэнергатэрапіі на алкаголікаў, — расказвае ён. — Так, прыток жыццёвай энергіі выклікае пераарыентацыю жыццёвых каштоўнасцяў. Але, на жаль, часовую. Карэкцыя адбываецца, а мужнасці і жадання стрымлівацца ў большасці няма.

Што датычыцца спажывання алкаголю здаровым чалавекам, то навука вызначылася з бяспечнай колькасцю. Гэта 40—80 грамаў у пераліку на гарэлку: некалькі дзён на тыдзень, і пажадана пасля вячэры.

6. І, нарэшце, **анкалогія**.

— Гэта трагедыя, якая, на жаль, здараецца з людзьмі, — гаворыць лекар. — Шукаюць прычыну гэтай страшнай хваробы, вывучаюць абмен рэчываў, біяхімію, уплыў харчавання і фізічныя нагрузкі, і гэтак далей. А я мяркую, што гэта праблема кармічная, якая звязана з запасам жыццёвай энергіі. 95 працэнтаў анкахворых — гэта людзі са слабым дыханнем. А работа лёгкіх на 35—40 працэнтаў вызначае энергетычны патэнцыял чалавека. Ёсць тут заканамернасць, і мне падаецца, што людзі з вялікім аб'ёмам лёгкіх могуць у плане анкалогіі «спаць спакойна».

Валянцін Таранаў называе шарлатанамі тых, хто агітуе хворых на анкалогію, адмовіцца ад традыцыйнага лячэння, хірургічных умяшанняў і хіміятэрапіі. Зёлкамі, на жаль, ці энергаўздзеяннямі рак не перамагчы.

— І толькі пасля таго, як выдаленыя пашкоджаныя тканкі, як падаўленыя метастазы, паўстае праблема аднаўлення жыццёвых сіл чалавека, — перакананы лекар. — Гэта ёсць праца для дактароў нетрадыцыйнай медыцыны. Трэба падключаць і фітатэрапію, і біяэнергетыку. Таму што ў хворага на анкалогію практычна нулявы патэнцыял жыццёвай энергіі.

Чалавецтва шукае лекі супраць раку, але Таранаў упэўнены, што ў прыродзе такога няма і ніколі не будзе. Самым магутным лякарствам ён лічыць стан імуннай сістэмы, уласнай абароны арганізма чалавека. Трэба ўмацоўваць імунітэт, заклікае Валянцін Мікалаевіч.

**Запісала Ілона ІВАНОВА.**
*г. Горкі.*
***(Заканчэнне будзе.)***

## На Брэстчыне сёлета канфіскавана 35 тон самагону і брагі

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік упраўлення аховы правапарадку АУС Брэсцкага аблвыканкама палкоўнік Генадзь Бахараў, з пачатку года ад насельніцтва было атрымана 674 сігналы аб фактах парушэння антыалкагольнага заканадаўства.

Па стану на 24 сакавіка ў заходнім рэгіёне было выяўлена і канфіскавана каля 35 тон самагону і самагоннай брагі, а таксама сфальсіфікаваных спіртных напояў вагой больш за 13,5 тоны. Работнікамі міліцыі за гэты час было выяўлена каля 700 фактаў па незаконнай рэалізацыі алкагольнай прадукцыі. Найбольш актыўна з самагонаварэннем вядзецца барацьба ў Пружанскім раёне, дзе сёлета было знішчана 5,7 тоны самагоннай вадкасці.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

Прадпрымальніцтва

# «Калёсы едуць нармальна, але вельмі павольна...»

У пятніцу ў Магілёве прайшло пасяджэнне Савета па развіццю прадпрымальніцтва пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. На ім старшынстваваў міністр статыстыкі і аналізу Беларусі Уладзімір Зіноўскі.

Члены Савета наведалі магілёўскае прыватнае прадпрыемства машынабудавання «Тэхналіт», якое сёння выпускае імпартазмяшчальную прадукцыю. Менавіта развіццё вытворчага прадпрымальніцтва стала прадметам абмеркавання Савета.

Паводле статыстыкі, сёння 40 працэнтаў малых прадпрыемстваў і 80 працэнтаў індывідуальных прадпрымальнікаў занятыя гандлем, прычым у большасці імпартнай прадукцыяй. Паводле слоў Уладзіміра Зіноўскага, прыватнікам надыходзіць час развівацца і пераходзіць у рэальны сектар эканомікі, у вытворчую сферу.

Савет вывучаў, чым можна сёння дапамагчы прадпрымальнікам, якія працуюць у вытворчасці. Яны расказвалі пра свае праблемы: пра складанасці з атрыманнем банкаўскіх крэдытаў, адсутнасць доступу да сыравіны, пра павелічэнне арэнднага кошту вытворчых плошчаў, пра мытныя перашкоды пры ўвозе ў краіну тэхналагічнага абсталявання і гэтак далей.

Прыватнікі просяць стварыць гарантыйны дзяржаўны фонд: без гэтага, паводле іх меркавання, масавых інвестыцыйных праектаў у вытворчай сферы не будзе. А таксама шырока і паўсюдна перадаваць ім асноўныя фонды: у першую чаргу, будынкі, якія не выкарыстоўваюцца альбо недабудаваныя. Паводле слоў аднаго з удзельнікаў пасяджэння, «калёсы едуць нармальна, але вельмі павольна». Між тым, для канкрэтнага асяроддзя важныя час, хуткасць вырашэння пытанняў.

Праблемы, узнятыя на пасяджэнні Савета па развіццю прадпрымальніцтва, будуць абагульнены і даложаны кіраўніцтву краіны.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ВЫРАТАВАЛІ КАРОВУ

**У Рагачове супрацоўнікі МНС выратавалі карову, якая правалілася ў склеп, і дапамаглі гаспадарам прыняць у яе роды.**

Як паведаміла спецыяліст групы прапаганды Рагачоўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Раіса Росал, званок з незвычайнай просьбай аб дапамозе паступіў ад жыхаркі раённага цэнтра. Жанчына расказала аб тым, што яе карова, якой хутка цяліцца, выйшла з незачыненага хлява і правалілася ў склеп. Дзяжурны каравул выехаў на выратаванне жывёлы. Калі карова была практычна гатовая да пад'ёму, у яе пачаліся роды. Выратавальнікам давялося дапамагаць гаспадыні і ў гэтай няпростай справе. Пасля таго, як карова ацялілася, супрацоўнікі МНС з дапамогай лябёдкі паднялі наверх цэлымі і непашкоджанымі карову і яе цяля.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

Канферэнц-зала

# ЭХ, ЗАЛЁТНЫЯ!

## Сёлета з Беларусі былі высланы 18 замежнікаў, якія груба парушылі Правілы дарожнага руху

**Мы, беларусы, — гасцінныя людзі. Аднак з іншаземцамі, якія парушаюць нашы законы, не цырымонімся. Такіх «свавольнікаў» праваахоўныя органы краіны адразу ж выганяюць на гістарычную радзіму.**

Як паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента па грамадзянству і міграцыі МУС Беларусі Генадзь Бубновіч, з году ў год павялічваецца колькасць гасцей нашай краіны. Летась, напрыклад, толькі ў органах унутраных спраў Беларусі зарэгістраваліся больш за 300 тысяч іншаземцаў. Гэта на 50 тысяч больш, чым у 2005 годзе. І пераважная большасць замежнікаў паводзіць сябе ў нашай краіне законапаслухмяна. Летась іншаземцы здзейснілі 1923 злачынствы, што амаль на 9 працэнтаў менш, чым пазалетась. Беларускія праваахоўныя органы даволі жорстка ставяцца да замежных гасцей, якія здзяйсняюць нават адміністрацыйныя правапарушэнні. Напрыклад, за грубае парушэнне Правілаў дарожнага руху, у асноўным за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення, у гэтым годзе былі высланы з нашай краіны 18 замежнікаў. Летась за падобныя «свавольствы» з беларускай зямлі былі выгнаны 164 іншаземцы. Таксама не затрымліваюцца ў Беларусі і замежныя грамадзяне, якія адбывалі пакаранне ў тутэйшых месцах пазбаўлення волі. У мінулым годзе на гістарычную радзіму былі адпраўлены 445 такіх асобаў. Сярод няпрошаных гасцей апошнім часам апынуліся і гандляры насваем. Гэтае зелле набывае папулярнасць у беларускіх падлеткаў, што вельмі непакоіць супрацоўнікаў міліцыі і медыкаў. Бо насвай наносіць шкоду арганізму: выклікае гібель нервовых клетак, а нярэдка і моцныя апёкі. Паколькі гэтае зелле пакуль не аднесена да ліку наркотыкаў, то крымінальная адказнасць за яго распаўсюджванне ў Беларусі не прадугледжана, але гандаль забаронены. Аднак некаторыя паўднёвыя госці не зважаюць на нашы парадкі і едуць у Беларусь са сваім насваем. Праўда, доўга тут не затрымліваюцца. Сёлета міліцыянеры ўжо выслалі з Беларусі 5 грамадзян Узбекістана і 2 таджыкаў, якія гандлявалі насваем.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

Навіны сталіцы

# Мільён — у Чырвоным Бары

**З пачатку года, у сувязі з ростам цэн на энерганосьбіты, кошт будаўніцтва кватэр для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, істотна не павялічыўся. Сталічнае ўпраўленне капітальнага будаўніцтва запланавала ўзвесці сёлета 445 тысяч квадратных метраў жылля толькі для чаргавікоў. Вакол новых дамоў будуць з'яўляцца школы, дзіцячыя сады, на першых паверхах шматкватэрных будынкаў адчыняцца магазіны.**

«Прынцып комплекснай забудовы, калі адначасова са стварэннем новага жылля плануюцца і аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, ужо рэалізуецца ў новых мікрараёнах сталіцы, — гаворыць начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва (УКБ) Мінскага гарвыканкама Андрэй Галь. — У прыватнасці, у мікрараёне «Дружба» сёлета будуць узведзены 100 тысяч квадратных метраў, новыя дамы агульнай плошчай каля трыццаці тысяч квадратаў з'явяцца ў раёне вуліцы Гурскага».

Акрамя будаўніцтва вялікіх дамоў, на вуліцах Барадзінскай, Сонечнай і Козыраўскай пачынаюцца работы па ўзвядзенню жылых дамоў з невялікай колькасцю паверхаў. Там будуць знесены 70 старых дамоў. Ужо ў гэтым годзе на месцы старога жылля з'явіцца першы дом, каля якога размесціцца некалькі школ, чатыры дзіцячыя садкі, спартыўныя пляцоўкі. Акрамя таго, да канца гэтага года заселяцца новыя кватэры ў мікрараёнах Сухарава-4, -5, Лошыца.

Паводле інфармацыі Андрэя Галя, у наступным годзе вялізная тэрыторыя пад будаўніцтва будзе асвоена ў Чырвоным Бары. Зараз інстытут «Мінскпраект» працуе над праектамі, ажыццяўленне якіх будзе праходзіць у дзве чаргі. Усяго ж у мікраараёне трэба пабудаваць 1 мільён квадратных метраў жылля.

Для катэгорыі грамадзян, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, кошт квадратнага метра, як і раней, разлічваецца па каштарысу 1991 года, з улікам індэксацыі на сённяшні ўзровень цэн. У 2007 годзе прагнозны індэкс будаўніча-мантажных работ складзе 9,8 працэнта. Штомесячнае яго павелічэнне вытрымліваецца.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**


**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2007 Г.**
**ОАО «БОРИСОВБЫТСПЕЦСЕРВИС»**
**222525 г. Борисов-15, ул. Бр. Вайнрубов, 7**

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На отчетную дату |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 45 | 20 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 8 | 8 |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 53 | 71 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 36 | 25 |
| Налоги по приобретенным ценностям | 220 | 9 | 8 |
| Готовая продукция и товары | 230 | 5 | 3 |
| Дебиторская задолженность | 250 | 22 | 34 |
| Денежные средства | 270 | 22 | 21 |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 94 | 91 |
| **БАЛАНС (сумма срок 190+290)** | **390** | **147** | **162** |
| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На отчетную дату |
| **III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ** | | | |
| Уставный фонд (капитал) (80) | 510 | 45 | 45 |
| Нераспределенная прибыль (84) | 540 | 5 | 25 |
| ИТОГО по разделу III | 590 | 53 | 83 |
| **IV. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | **-5** | **-3** |
| **V. РАСЧЕТЫ** | | **0** | **0** |
| Кредиторская задолженность | 730 | 99 | 82 |
| ИТОГО по разделу V | 790 | 99 | 82 |
| **БАЛАНС (сумма срок 390+490+590)** | **890** | **147** | **162** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2006 ГОД**
**ОАО «БОРИСОВБЫТСПЕЦСЕРВИС»**
**222525 г. Борисов-15, ул. Бр. Вайнрубов, 7**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. Доходы и расходы по видам деятельности** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и аналогичных обязательных платежей) | 030 | 849 | 688 |
| Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг | 040 | 757 | 648 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 070 | 92 | 40 |
| **II. Операционные доходы и расходы** | | | |
| Операционные расходы (за минусом НДС, акцизов и аналогичных обязательных платежей) | 100 | 14 | 0 |
| Операционные расходы | 110 | 5 | 0 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 130 | 9 | 0 |
| **III. Внереализационные доходы и расходы** | | | |
| Внереализационные доходы | 140 | 0 | 0 |
| Внереализационные расходы | 170 | 53 | 39 |
| Сумма источников собственных средств, направленных на покрытие убытков | 180 | 0 | 11 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 190 | -53 | -28 |
| **Прибыль (убыток) за отчетный период** | 200 | 48 | 12 |
| Налоги и сборы, платежи и расходы, произведенные из прибыли | 210 | 28 | 12 |
| **Прибыль (убыток) к распределению** | 240 | 20 | 0 |

Бухгалтерский баланс ЗАСО «Виктория» за 2006 год г. Минск, ул. Тимирязева, 65-а *млн. руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* |
| **Основные средства** | **30,9** | **Источники собственных средств, всего** | **658,9** |
| **Нематериальные активы** | **4,4** | в том числе: уставный фонд | **540,0** |
| **Финансовые вложения, всего** | **323,2** | резервный фонд | **4,3** |
| в том числе: инвестиции в дочерние общества | - | добавочный фонд | **56,6** |
| инвестиции в другие организации | - | фонд накопления | - |
| облигации и другие долговые обязательства | **323,2** | фонд потребления | - |
| прочие финансовые вложения | - | целевое финансирование | - |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **78,9** | нераспределенная прибыль прошлых лет | - |
| **Дебиторы, всего** | **13,5** | нераспределенная прибыль отчетного года | **58,0** |
| в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | - | **Страховые резервы и фонды, всего** | **442,8** |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | - | в том числе: страховые резервы | **441,3** |
| дебиторская задолженность (кроме операции страхования, сострахования и перестрахования) | **13,5** | фонд (резерв) предупредительных мероприятий | **1,5** |
| **Прочие активы, всего** | **750,1** | гарантийные фонды | - |
| в том числе: незавершенное строительство | - | **Кредиторы, всего** | **98,1** |
| материальные ценности и затраты | **18,8** | В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования, перестрахования | **81,3** |
| денежные средства | **730,6** | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | - |
| собственные акции (доли) | - | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | - |
| прочие активы | - | заемные средства | - |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | **0,7** | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | **16,8** |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | - | Прочие пассивы | **1,2** |
| **БАЛАНС** | **1201,0** | **БАЛАНС** | **1201,0** |

Отчет о финансовых результатах ЗАСО «Виктория» за 2006 год г. Минск, ул. Тимирязева, 65-а

| *Наименование показателя* | *Код строки* | *За отчетный период* |
|---|---|---|
| **I. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | - |
| Страховые выплаты | 020 | - |
| Изменение по страхованию жизни (+ или -) | 030 | - |
| Отчисления в гарантийный фонд | 040 | - |
| Расходы на ведение дела | 041 | - |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 050 | - |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | **558,2** |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | 067 | **-125,9** |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | **37,1** |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | 092 | **-13,8** |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | - |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | - |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | **5,6** |
| Расходы на ведение дела | 120 | **200,6** |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | **11,4** |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | **19,8** |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | 130 | **166,8** |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные к разделу I и II** | | |
| Операционные доходы | 140 | **55,5** |
| Операционные расходы | 145 | **10,2** |
| Внереализационные доходы | 150 | **1,6** |
| Внереализационные расходы | 155 | **8,9** |
| Финансовый результат | 157 | **204,8** |
| Использование прибыли | 158 | **146,8** |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 170 | **58,0** |

*Достоверность баланса подтверждена аудиторским обществом «Промаудит» (лицензия № 02200/0061721 от 03.02.2004 г., выдана Министерством финансов Республики Беларусь). Результаты проведенной проверки за период с 1 января 2006 г. по 31 декабря 2006 г. показывают, что отчетность ЗАСО «Виктория» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2006 год.*

**ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ открытого акционерного общества «АФПК «Жлобинский мясокомбинат» за 2006 год**

| *Номер строки* | *Наименование показателей* | *Единица измерения* | *За 2006 год* |
|---|---|---|---|
| 1. | Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | миллионов рублей | 75797 |
| 2. | Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | миллионов рублей | 71763 |
| 2.1 | Из них на оплату труда | | 6561 |
| 3. | Прибыль (убыток) за отчетный период | миллионов рублей | 4066 |
| 4. | Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | миллионов рублей | 1476 |
| 5. | Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 537 |
| 6. | Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | 676 |
| 7. | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | миллионов рублей | — |
| 8. | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 259 |
| 9. | Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде | рублей | 42,437 |
| 10. | Количество акционеров — всего | лиц | 3640 |
| | В том числе: | | |
| 10.1 | Юридических лиц | лиц | 120 |
| 10.2 | Физических лиц | лиц | 3520 |
| 11. | Среднесписочная численность работающих | человек | 1158 |
| 12. | Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 21,694 |

